*Ю. М. ГАЛКОЎСКАЯ*

# ПРАВАВАЯ КАМПЕТЭНЦЫЯ ЯК ЭЛЕМЕНТ САЦЫЯЛЬНА-ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ БІБЛІЯТЭКАРА-БІБЛІЁГРАФА

*Робіцца спроба вызначыць месца прававой кампетэнцыі ў сістэме акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый, якія фарміруюцца ў працэсе падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі. Разглядаюцца асноўныя задачы прафесійна арыентаванай прававой падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа, змястоўна-дзейнасныя патрабаванні да бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі выпускніка па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».*

На сучасным этапе сістэмаўтваральным фактарам у мадэлі спецыяліста з’яўляецца кампетэнтнасць, фарміруемая і развіваемая на аснове кампетэнцый у арганічным адзінстве з каштоўнаснымі арыентацыямі асобы. Існуе мноства азначэнняў паняццяў «кампетэнтнасць» і «кампетэнцыя». Даволі часта гэтыя тэрміны атаясамліваюцца. Тэарэтыка-метадалагічныя пазіцыі шматлікіх даследчыкаў сыходзяцца ў тым, што кампетэнтнасць мае інтэгратыўны, дзейнасны, асобасны характар і выступае як адзінства ведаў і вопыту, накіраваных на паспяховую дзейнасць [6, с.88]. Адным з найбольш аўтарытэтных з’яўляецца азначэнне кампетэнтнасці, дадзенае І. А. Зімняй: кампетэнтнасць – гэта актуальная, фарміруемая асобасная якасць, заснаваная на ведах, інтэлектуальна і асобасна абумоўленая сацыяльна-прафесійная характарыстыка чалавека [7, с.23]. Адпаведна адукацыйнаму стандарту Рэспублікі Беларусь (ОС РБ 1-23 01 11-2008) «кампетэнтнасць» уяўляецца як веды, уменні і вопыт, неабходныя для рашэння тэарэтычных і практычных задач [2, с.4].

Фарміраванне сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара-бібліёграфа ажыццяўляецца перш за ўсё ва ўмовах ВНУ. Як адзначаюць Н. В. Драздова і А. П. Лабанаў, «вышэйшая школа ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў вырашае дзве ўзаемазвязаныя задачы: бягучую (навучанне студэнтаў агульнанавуковым і прафесійным дысцыплінам) і перспектыўную, ці пралангаваную (фарміраванне прафесійных кампетэнцый і кампетэнтнасцей)» [5, с.20].

Згодна з ОС РБ 1-23 01 11-2008, падрыхтоўка бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі павінна выражацца ў фарміраванні акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных груп кампетэнцый. Развіццё ў студэнтаў дадзеных груп кампетэнцый забяспечвае канчатковы інтэграваны вынік адукацыі – сфарміраваную ў выпускніка сацыяльна-прафесійную кампетэнтнасць бібліятэкара-бібліёграфа. І. А. Зімняя пад сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасцю выпускніка разумее яго асобасную, інтэграваную якасць, якая фарміруецца і праяўляецца ў рашэнні стандартных і нестандартных задач, адэкватных усёй разнастайнасці сацыяльных і прафесійных сітуацый [8; 11].

Значнае месца сярод кампетэнцый спецыяліста кваліфікацыі бібліятэкар-бібліёграф займае прававая кампетэнцыя. Гэта, з аднаго боку, абумоўлена істотна ўзрастаючымі патрабаваннямі, якія прад’яўляюцца да ўзроўню прававой падрыхтоўкі ўсіх членаў грамадства, а з другога боку, прававое поле – гэта неад’емны элемент любой прафесійнай дзейнасці, які забяспечвае яе ўстойлівае функцыянаванне на аснове ўстаноўленых нормаў і правіл. Адпаведна канцэпцыі прафесіяналізму (Э. М. Каліцкі і Н. Г. Ганчарык) [9], заснаванай на разуменні прафесіі як мностве семантычных палёў, любая прафесія складаецца з інфармацыйнага, дзейнасна-тэхналагічнага, антрапалагічнага і прававога семантычных палёў. Прававое поле прафесіі, паводле меркавання названых аўтараў, – гэта нарматыўнае асяроддзе для выканання функцый, сукупнасць паўнамоцтваў і адказнасці, якімі надзяляецца пасада [9]. Канцэпцыя Э. М. Каліцкага і Н. Г. Ганчарык дазваляе абгрунтавана сцвярджаць, што прававая кампетэнцыя з’яўляецца адным са значных складнікаў прафесійнай характарыстыкі і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці спецыяліста.

Неабходнасць прававой падрыхтоўкі бібліятэкара-бібліёграфа першапачаткова закладзена на ўзроўні дзяржаўных патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый. У кваліфікацыйным даведніку «Пасады служачых, занятых у культуры і мастацтве» [1] паступова ад пасады да пасады (галоўны бібліятэкар, галоўны бібліёграф і г. д.)

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прадугледжваецца неабходнасць ведаць нарматыўныя прававыя акты, якія рэгламентуюць развіццё сферы культуры, у тым ліку па пытаннях бібліятэчнай справы. Таксама ў ОС РБ 1-23 01 11-2008, дзе ўтрымліваецца кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста бібліятэкара-бібліёграфа, сярод патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый указваецца: «уменне працаваць з юрыдычнай літаратурай, валодаць заканадаўчай, нарматыўна-прававой і адміністрацыйнай сістэмай кіравання бібліятэчнай справай краіны».

Прававая кампетэнцыя фарміруецца паступова на розных узроўнях і этапах станаўлення асобы. Абітурыент, які паступіў на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», мае пэўны ўзровень прававой кампетэнтнасці ў межах адной з сацыяльных кампетэнцый – кампетэнцыі грамадзянскасці. У сваю чаргу, у ВНУ прававая кампетэнцыя фарміруецца як мінімум у двух кірунках: з аднаго боку, яна атрымлівае далейшае развіццё як складнік сацыяльнай кампетэнтнасці; з другога боку – датычна будучай прафесіі яна прафесійна канкрэтызуецца. Пасля атрымання вышэйшай кваліфікацыі «бібліятэкар-бібліёграф» прававая кампетэнцыя спецыяліста не набывае рысы статычнасці, яна развіваецца і ўдасканальваецца ў працэсе яго прафесійнай дзейнасці.

Мяркуем, прававая кампетэнцыя не лакалізуецца толькі ў адной з груп кампетэнцый, яна паўнапраўна з’яўляецца элементам як акадэмічных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый, так і прафесійных. У кожнай з названых груп яна змястоўна трансфармуецца да мэт і задач фарміравання канкрэтнай кампетэнцыі і, адпаведна, ад групы да групы праяўляецца на розным узроўні асэнсавання.

Акадэмічныя кампетэнцыі ўключаюць веды і ўменні па асвоеных дысцыплінах, здольнасці і ўменні вучыцца [2; 3]. Прававы кампанент акадэмічных кампетэнцый павінен разглядацца ў кантэксце асвоеных дысцыплін (напрыклад, для студэнта-першакурсніка – гэта дысцыпліна «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» і г. д.); прававы кампанент у сістэме сацыяльна-асобасных кампетэнцый праяўляецца ў працэсе фарміравання кампетэнцыі грамадзянскасці і патрыятызму, якая прадугледжвае вывучэнне такіх дысцыплін, як «Асновы права», «Правы чалавека». Але група сацыяльна-асобасных кампетэнцый не прадугледжвае паглыбленага вывучэння прававых аспектаў дзейнасці бібліятэк, інакш кажучы, прафесійна арыентаваных норм і асаблівасцей іх выканання. Зыходзячы з гэтага, можна дапусціць, што прафесійна арыентаваную прававую кампетэнцыю неабходна фарміраваць у рамках трэцяй групы – групы прафесійных кампетэнцый. Але тут узнікае метадалагічная цяжкасць – права не з’яўляецца прафесійнай дысцыплінай для бібліятэкара-бібліёграфа, прававая кампетэнцыя, па сутнасці, не з’яўляецца прафесійнай кампетэнцыяй дадзенага спецыяліста.

ОС РБ 1-23 01 11-2008 прадугледжвае з пункту гледжання прафесійнай падрыхтоўкі спецыяліста толькі адну групу кампетэнцый – прафесійных. Міжпрадметныя кампетэнцыі, існуючыя на стыку дысцыплін, у сувязі з такім выдзяленнем цяжка ўпісваюцца ў дадзеную сістэму.

У такім кантэксце ўяўляе інтарэс распрацаваная ў Расійскай Федэрацыі мадэль спецыяліста (бакалаўра і магістра), дзе ўтрымліваюцца тры групы кампетэнцый, якімі характарызуецца спецыяліст, што асвоіў адукацыйную праграму бакалаўра (магістра)-спецыяліста. Гэта – сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі; кампетэнцыі агульнапрафесійныя (напрыклад, інфармацыйныя, кіраўніцкія, арганізацыйныя, эканамічныя і г. д.); спецыяльныя кампетэнцыі. Фундаментам у дадзенай мадэлі з’яўляюцца сацыяльна-асобасныя і агульнапрафесійныя кампетэнцыі, якія дазваляюць выпускніку гібка арыентавацца на рынку працы [10, с.94–95]. Такім чынам, дадзеная мадэль прадугледжвае дзве групы кампетэнцый, звязаных з прафесіяй.

Прыведзены прыклад дазваляе сцвярджаць, што неабходна выдзяляць некалькі груп кампетэнцый, арыентаваных на прафесію, паколькі лакалізацыя прафесійна арыентаваных кампетэнцый толькі ў адной групе – «прафесійныя кампетэнцыі» – выключае міжпрадметныя сувязі і ўпускае комплекс кампетэнцый, якія фарміруюцца на стыку розных галін ведаў (напрыклад, права і бібліятэказнаўства, эканоміка і бібліятэказнаўства і г. д.). На наш погляд, гэта:

– група міжпрадметных прафесійна арыентаваных кампетэнцый, якія ўзнікаюць на стыку некалькіх галін ведаў і практыкі і з’яўляюцца значнымі для шырокага кола прафесій

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(як правіла, абавязковым элементам такіх кампетэнцый будзе права, якое выступае часткай семантычных палёў кожнай прафесіі). У залежнасці ад сферы дзейнасці міжпрадметныя кампетэнцыі прафесійна арыентуюцца, прывязваюцца да пэўнага віду прафесійнай дзейнасці. У нашым выпадку – гэта бібліятэказнаўча-прававая кампетэнцыя ці прававая кампетэнцыя прафесійна арыентаваная (на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»);

– група спецыяльных, ці прафесійна-функцыянальных, кампетэнцый, якія прадугледжваюць вузка прафесійную арыентацыю з канкрэтнай прывязкай да прафесійнай дзейнасці і яе спецыфікі. Можна меркаваць, што для бібліятэчнай справы гэта будуць, у прыватнасці, бібліятэказнаўчая кампетэнцыя, бібліяграфазнаўчая кампетэнцыя і г. д.

Найбольш выяўленая неабходнасць фарміравання прававога кампанента ў працэсе падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа ўзнікае пры фарміраванні прафесійна арыентаванай міжпрадметнай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі, а таксама пры фарміраванні сацыяльна-асобасных кампетэнцый, а іменна кампетэнцыі грамадзянскасці і патрыятызму. Прававы кампанент у прафесійна-функцыянальных кампетэнцыях будзе прысутнічаць на ўзроўні дэталізацыі датычна канкрэтных прыватных асаблівасцей тых ці іншых адносін, якія рэгулююцца канкрэтнымі нормамі права.

Бібліятэказнаўча-прававая кампетэнцыя як прафесійна арыентаваная (на спецыяльнасць «бібліятэказнаўства і бібліяграфія») заснавана на прадметных, дзейнасных і каштоўнасна-сэнсавых ведах, уменнях і вопыце, неабходных для рашэння тэарэтычных і практычных задач, што ўзнікаюць у прававым полі функцыянавання бібліятэкі, рэалізацыі правоў і абавязкаў суб’ектаў праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк. У аснову выдзялення структурных кампанентаў разглядаемай кампетэнцыі мы паклалі работу В. І. Байдэнкі [4, с.40], які абагульніў шэраг тэарэтычных і практычных распрацовак і прапанаваў кампаненты кампетэнцый выпускнікоў ВНУ. Гэта наступныя складнікі: *кагнітыўны* (веды і разуменне), *дзейнасны* (практычнае і аператыўнае прымяненне ведаў) і *каштоўнасны* (каштоўнасці як арганічная частка спосабу ўспрымання жыцця ў сацыяльным кантэксце).

Звяртаючыся да змястоўнага складу прафесійна арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі, неабходна вызначыць, якім відам дзейнасці яна карысна. Адным з агульных патрабаванняў ОС РБ 1-23 01 11-2008 да ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста з’яўляецца патрабаванне ведаць прававыя нормы, умець улічваць іх у сваёй жыццядзейнасці (п. 6.1.2). Дадзенае палажэнне развіваецца ў патрабаваннях да прафесійных кампетэнцый: выпускнік павінен выкарыстоўваць і пры неабходнасці распрацоўваць сумесна з іншымі падраздзяленнямі бібліятэкі арганізацыйна-распарадчыя, нарматыўныя і тэхналагічныя дакументы дзейнасці бібліятэкі (навукова-метадычная дзейнасць); выпускнік павінен умець працаваць з юрыдычнай літаратурай, валодаць заканадаўчай, нарматыўна-прававой і адміністрацыйнай сістэмай кіравання бібліятэчнай справай краіны (арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць) (п. 6.4) [2].

Акрамя арганізацыйна-кіраўніцкай і навукова-метадычнай дзейнасці, мэтазгодна лічыць, што прафесійна арыентаваныя прававыя веды, уменні і вопыт неабходны бібліятэкару-бібліёграфу і ў працэсе яго камунікатыўнай дзейнасці: у сістэме адносін бібліятэкар-бібліёграф (далей – спецыяліст) – карыстальнік бібліятэкі; спецыяліст – спецыяліст; спецыяліст – знешнія партнёры па дзейнасці. Узнікае шэраг адносін, якія рэгулююцца прававымі нормамі і прадугледжваюць рэалізацыю пэўных правоў і абавязкаў усіх бакоў, што ўдзельнічаюць ва ўзаемаадносінах. Гэта, безумоўна, сведчыць, што бібліятэкар-бібліёграф павінен ведаць свае правы і абавязкі, правы і абавязкі карыстальнікаў бібліятэк, аўтарскія правы і парадак іх выканання і інш.

Асноўнымі задачамі прафесійна арыентаванай прававой падрыхтоўкі будучага бібліятэкара-бібліёграфа павінны быць:

– фарміраванне на аснове міждысцыплінарнага падыходу сістэмных ведаў аб бібліятэцы як суб’екце прававога рэгулявання; правах і абавязках суб’ектаў праваадносін у сферы дзейнасці бібліятэк; базавых праваадносінах, якія ўзнікаюць у працэсе дзейнасці бібліятэк; структуры бібліятэчнага заканадаўства; сістэме інстытутаў улады і грамадска-прафесійных інстытутаў, адказных за распрацоўку, прыняцце і рэалізацыю нарматыўных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прававых актаў у сферы дзейнасці бібліятэк; сусветных тэндэнцыях у галіне бібліятэчнага заканадаўства; аб пытаннях выканання аўтарскіх правоў у працэсах фарміравання бібліятэчных фондаў і бібліятэчнага абслугоўвання; аб комплексе лакальных нарматыўных прававых дакументаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэчнай установы;

– фарміраванне ўмення прымяняць прававыя веды, прававыя нормы для рашэння прафесійных задач, у тым ліку ўмення аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў працэсе абслугоўвання ў цэнтрах прававой інфармацыі, якія функцыянуюць пры бібліятэках;

– фарміраванне ў студэнтаў разумення важнасці дамінанты прававога характару паводзін у сацыяльных і прафесійных зносінах;

– развіццё здольнасці да пастаяннай самаадукацыі, у тым ліку ў дачыненні да прававых ведаў, і эфектыўнай самарэалізацыі ў прафесіі.

Змястоўна-дзейнасныя патрабаванні да бібліятэказнаўча-прававой кампетенцыі выпускніка неабходна адлюстроўваць праз такія катэгорыі, як «веды» *(кагнітыўны складнік кампетэнцыі)* і «ўменні» *(дзейнасны складнік кампетэнцыі)*. *Каштоўнасны складнік* кампетэнцыі прадугледжвае сфарміраваныя каштоўнасна-сэнсавыя адносіны да яго зместу і ролі ў прафесійнай дзейнасці (гл. табліцу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца*

**Агульныя патрабаванні да бібліятэказнаўча-прававой кампетэнцыі выпускніка па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія»**

| ***Выпускнік павінен ведаць (мець веды)*** | ***Выпускнік павінен умець (валодаць уменнямі)*** |
|---|---|
| – тэарэтычныя асновы прававога забеспячэння дзейнасці бібліятэк;<br>– заканадаўчую, нарматыўна-прававую і адміністрацыйную сістэму кіравання бібліятэчнай справай краіны;<br>– прынцыпы, якія ляжаць у аснове прававога рэгулявання дзейнасці бібліятэк;<br>– правы і абавязкі суб’ектаў прававога рэгулявання ў сферы дзейнасці бібліятэк;<br>– прававы статус бібліятэкара-бібліёграфа і прававы статус яго партнёраў па зносінах;<br>– сістэму праваадносін, якія ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэк;<br>– профільныя нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць дзейнасць бібліятэк, а таксама акты сумежнага заканадаўства;<br>– комплекс лакальных нарматыўна-прававых актаў, якія забяспечваюць арганізацыйную дзейнасць бібліятэкі;<br>– асаблівасці прававога рэгулявання адносін, якія ўзнікаюць з нагоды: стварэння, ліквідацыі, развіцця бібліятэк і бібліятэчных сетак; фарміравання фондаў бібліятэк; бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў; узаемадзеяння работадаўца з персаналам (кадрамі); фарміравання і выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк | – працаваць з юрыдычнай літаратурай, прававымі базамі даных;<br>– выкарыстоўваць і распрацоўваць арганізацыйна-распарадчыя і нарматыўныя дакументы;<br>– ствараць лакальны пакет прававых дакументаў, рэгулюючых дзейнасць бібліятэчна-інфармацыйных устаноў;<br>– рэалізоўваць і абараняць правы і інтарэсы бібліятэкі, паважаць і абараняць правы і інтарэсы карыстальнікаў бібліятэк і іншых суб’ектаў грамадскіх адносін, што ўзнікаюць у працэсе функцыянавання бібліятэкі;<br>– аказваць кансультатыўна-прававую дапамогу ў працэсе абслугоўвання ў цэнтрах прававой інфармацыі, якія функцыянуюць пры бібліятэках;<br>– інтэграваць тэарэтычныя прававыя веды, звязаныя з дзейнасцю бібліятэк, з практычнай дзейнасцю |
| ***Выпускнік павінен праяўляць да зместу кампетэнцыі і яе ролі ў прафесійнай дзейнасці пазітыўныя адносіны, у складзе якіх:*** | |
| – каштоўнасная арыентацыя на легітымны характар паводзін у сацыяльных і прафесійных зносінах | |
| – асэнсаваная сістэматычная актуалізацыя ведаў у сферы бібліятэчнага заканадаўства | |

Прававая кампетэнцыя як элемент сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара-бібліёграфа фарміруецца паступова, аднак ключавая стадыя яе фарміравання прыходзіцца на перыяд навучання ў ВНУ па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія». Сярод асноўных дысцыплін, якія ў той ці іншай ступені накіраваны на прававую падрыхтоўку бібліятэкара-бібліёграфа вышэйшай кваліфікацыі ў цыкле агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, можна назваць «Асновы кіравання інтэлектуальнай маёмасцю» *(група агульнапрафесійных дысцыплін)*, «Бібліятэчна-інфармацыйны маркетынг і менеджмент» *(група спецыяльных дысцыплін)*, «Інфармацыйны рынак і яго прававое забеспячэнне» *(група – дысцыпліны па напрамках спецыяльнасці)*, навукова-метадычную работу *(група дысцыплін спецыялізацыі)*. Але важна адзначыць, што фарміраванне і развіццё прафесійна арыентаванай бібліятэказнаўча-прававой кампетэнтнасці выпускніка ВНУ не могуць быць рэалізаваны выключна праз выкладанне адпаведных адукацыйных дысцыплін. Значнымі складнікамі гэтага працэсу з’яўляецца выкарыстанне разнастайных арганізацыйных форм вучэбнага працэсу, інавацыйных педагагічных сістэм і тэхналогій, методык актыўнага навучання, методык і тэхналогій бягучага і выніковага дыягнаставання вынікаў сацыяльна-прафесійнай падрыхтоўкі выпускнікоў.

---

1. *Об утверждении* квалификационного справочника «Должности служащих, занятых в культуре и искусстве» [Электронный ресурс]: постановление Министерства труда и

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

социальной защиты Респ. Беларусь от 29.12.2001, № 25. – Режим доступа: http://www.bankzakonov.com. – Дата доступа: 15.03.2011.

2. *ОС РБ 1-23 01 11-2008.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – Бібліятэкар-бібліёграф [Электронны рэсурс]. – Узамен РД РБ 02100.5.211-98; уведз. 12.06.2008. – Рэжым доступу: http://edubelarus. info. – Дата доступу: 15.03.2011.

3. *РД РБ 02100.5.227-2006.* Образовательный стандарт. Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин [Электронный ресурс]. – Взамен РД РБ 02100.5.277-99; введ. 01.09.2006. – Режим доступа: http://www.sporteducation.by. – Дата доступа: 15.03.2011.

4. *Байденко, В. И.* Выявление состава компетенций выпускников вузов как необходимый этап проектирования ГОС ВПО нового поколения: метод. пособие / В. И. Байденко. – М.: Исслед. центр проблем качества подгот. спец., 2006. – 72 с.

5. *Дроздова, Н. В.* Компетентностный подход как новая парадигма студентоцентрированного образования / Н. В. Дроздова, А. П. Лобанов. – Минск: РИВШ, 2007. – 100 с.

6. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов: компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск: РИВШ, 2009. – 336 с.

7. *Зимняя, И. А.* Компетентностный подход. Каково его место в системе современных подходов к проблеме образования? (Теоретико-методологический аспект) / И. А. Зимняя // Высшее образование сегодня. – 2006. – № 8. – С. 20–26.

8. *Зимняя, И. А.* Социально-профессиональная компетентность как целостный результат профессионального образования / И. А. Зимняя // Высшая школа: проблемы и перспективы: материалы 7-й Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 1–2 ноября 2005 г. – Минск, 2005. – С. 283–286.

9. *Калицкий, Э. М.* Современная концепция профессионализма / Э. М. Калицкий, Н. Г. Гончарик //Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 10. – С. 19–26.

10. *Педагогическое* образование в Республике Беларусь: аналитические материалы: практ. пособие / П. Д. Кухарчик [и др.]; под общ. ред. И. И. Цыркуна. – Минск: БГПУ, 2007. – 235 с.

11. *Становление* ключевых социальных компетентностей на разных уровнях образовательной системы (дескрипторная характеристика как база оценивания): материалы XI симп. «Квалиметрия в образовании: методология, методика, практика», Москва, 16–17 марта 2006 г. / под науч. ред. И. А. Зимней. – М., 2006. – 82 с.

*J. HALKOUSKAYA*

## A LEGAL COMPETENCE AS AN ELEMENT OF SOCIO-PROFESSIONAL COMPETENCE OF A LIBRARIAN-BIBLIOGRAPHER

The article stresses the importance of legal studies for librarian-bibliographers. The author attempts to define the place of legal competence in the system of academic, socio-personal and professional competence, which is being formed during the highly qualified librarian-bibliographers' training. The article formulates the main tasks for the legal training of a future librarian-bibliographer. It covers the demands to the essence of one's professionally-oriented legal competence of the graduating student on the specialty «Librarianship and bibliography».

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 01.04.2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ